Беларускі Шлях

Рэдакцыі Ново-Серпухуская 20
Адміністрацыі Захарэуская
«Юбілейны Дом».

...цыя адчынена ад 1 да 2 гадз
пасьля поудня.
...істрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.
...кцыя пакідае за сабой права па-
...яць перасыланые рукапісы і ка-
рэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да д му у Мін-
ску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак:
за верш петыту на 1-й стран 1 руб.
на апошняй—50 к. п.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 99. Менск. Чацьвер 22 жніўня 1918 г. Год I

Менск 22/VIII.

...а этнаграфічнай мапе проф. ...кага Беларусь займаець ... паветы, калі лічыць мерай ...дыя вялічыны павет. Уся-...беларускіх паветау 63. У ... рахунак мы ні узялі бе-...ускія акраіны Тверской і ...оускай губ.

...тары фронт раздзяліу пе-... Беларусь на дзьве часьці, ...ер новая граніца окупацыі ...ходзіць пры Оршы — По-...к. Ужо пасьля новай оку-...ыі Украіна забрала часьць ...есся і Чэрнігоускія бела-...кія паветы, Ілукстскі бе-...ускі павет Курл. губ. лі-...ца пры Курляндзіі. Мы яго ...ым да старой окупацыі. Об-...які прэдстаулясць наша ...ьбаушчына—Беларусь та-...калі будзем лічыць за ся-...нюю мэру плац павету.

...Занята:

...Старой окупацыей	17	пав
...Новай окупацыяй	$18^1/_2$	»
...Пад Вялікорасіей	$19^1/_2$	»
...Пад Украінай	8	»
разам	63	пав

...З чыста беларускіх губ-...р... над Расіей яшчэ астаецца: ...2 павета: Вітэбскай губ.; Ві-...скі, Веліжскі, Городоскі, ...вельскі, і палавіна Полоцга-... З Магілеушчыны пад Ра-...й 6 паветоу, Горэцкі, Клі-...віцкі, $^1/_2$ Магілеускай, Мсці-...уські, палавіна Оршанской, ...уські, Чэрыкоускі. Разам ... $^1/_2$ паветоу Магілеушчыны ... Вітэбшчыны.

...З змешаных губэрній пад ...сіей 8 беларускіх паветоу ...оленшчыны і 1 павет Ор-...ушчыны.

...Значыць пад Гэрманскай ...купацыяй старай і новай ...$^1/_2$ паветоу, і над Расійскай ...купацыей $10^1/_2$ паветау Мо-...леушчыны і Вітэбшчыны. З ...краінай вядуцца перэгаворы ...бязчарэчна і гістарычна бе-...рускіх паветах: Пінскім, Мо-...рскім, Рэчыцкім, Гомельскім, ...я пэуны, што гэтыя паветы ...м вернуць, бо на беларус-...й старане усе справедлівась-... стаяць.

...Мы інакш як цэлой і пдзя-...най прэдставіць сабе Бела-...сі ні можам.

Гэта вайна найбольш збурыла наш край. Калі граніца наміж Усходам і Заходам будзе праходзіць праз сярэдзіну Беларусі, то гэта заусягды будзе угрозай нашаму краю і нацыянальнай бядой, а с развіцием малодых сьвядомых беларускіх пакаленняу, беларускае пытание замеціць У Эуропе польскае запытание, і будзе стаяць вечным знакам запытания.

А. У.

Агульныя вести.

БЭРЛІН. 19 гм. Для аддачы Нямецкаму імпэратару ліста ад атамана донскай рэспублікі ген. Краснова у Бэрлін прыбыў князь Мікалай Лейхтэнбэрскі. У яго асыстэнцыі знаходзяцца: тымчасовы прэдстаўнік донскай рэспублікі пры урадзе у Кіеве ген. Тэрачукім, яго аквітант і старшы сын князя, так само Мікалай, які мае чын казацкаго эсаула. Князь Лейхтэнбэрскі, каторы начальствоваў на пачатку вайны адным з расійскіх палгоў, а пасьля быў аквітантам пры асобе цара, мае пасьля споўнення сваёй місіі у главнай кватэры, астацца сталым прэдстаўнікам донскаго ураду у Бэрліне.

ВАШЫНГТОН. 18 гм. «Reuter». Маскоўскі генэральны консул Злучаных Штатаў, Пуль, замераецца астацца у Маскве разам с ангельскімі і француэкімі консульскімі чынамі.

ЛЕНДАН. 17 гм. «Reuter». У Палестыне пачаўся набор жыдоў у войско.

ЛЕНДАН. 16 гм. «Reuter». Амэрыканскі военны міністр Бэкэр апавесьціў, што у Владывасток мае прыбыць для супольнай чыннасьці с чэхамі і японцамі 17 полк амэрыканскай пяхоты.

БЭРЛІН. 18 гм. Паведамленне у «Kreuz. Ztg.» з Хрысьціяніі зьвертае увагу на ангельскую экспэдыцыю на Шпітцбэрг, пад начальствам вядомаго бадача поўднёвага полюса Шэкльтона. Яна мае безварункова военныя мэты, а само абезпечэнне капальняў каменнаго вугля для ангельскаго флоту на Мурмане і на Ледавітым акіяне, а так само для занятай ангельцамі Мурманскай жалезьніцы (ж. д.).

Весткі з Расіі.

З Владзівастока паведамляюць у Маскву, што генэрал Рузскій які зьнік год таму назад, прыбыў у Владзівасток і аддаўся у распараджэнне ген. Горвата. Разам з Рузскім у Владзівасток прыбыў ген. Эвэрт.

Штокгольмскі «Socialdemokraten» паведамляе, што расійская С.-Д. Р. П. таемна ад большавікоў выслала ва ўсе кіраўнічыя соцыялістычныя органы Эўропы і Амэрыкі тэлеграму, у якой піша, што прэдстаўнікі рожных 40 хвабрык, каторыя абгаварывалі справу склікання агульнай работніцкай конфэрэнцыі, арыштаваны і пастаўлены перад найвыжшым рэволюцыйным судом.

Наміж арыштаванымі знаходзяцца Абрамій, Абрамовіч, Альтэр, Векелін і Сьмірноў.

Тэлеграма дамагалася соцыялістычных партыяў, каб перашкодзіць морду забраных членаў расійскай С.-Д.

З Бэрліну паведамляюць ад 17 гм., што паводлуг «Lokal» др. Гэльферых ні будзе далей знаходзіцца на чале нямецкаго пасольства у Расіі, прыwамсі пакуль яго будзе знайходзіцца у Пскове. Пакуль нямецкае пасольства аканчальна ні перанясецца у Пскоў, кіруючы справамі пасольства др. Рітулер будзе жыць у Рэвелі.

— Унутраныя справы Расіі, як выглядае с паведамленняў большэвіцкіх дэлегатаў на з'ездзі „совдепаў» нікава ставяла для большэвікоў.

У Екацерынбурскім «совдэпе ні знайшлося чалавека, які мог бы у свой час правідлово ацаніць занятце чэхословакамі Чэлябінска.

У патычная перад Ардаганом кастрамскі батальён быў разьбіты, што справіло паніку і змусіло астальныя большэвіцкія часьці уцекаць пакінушы ворагу вялікую здобыч. Пры гэтым Пэрмскі полк аказаў здраду і яго прышлося разаружыць.

У самым Екацерынбургу узбунтаваліся п. ів. «фронтовікі» і іх прышлося усьмірыць.

Калі чэхо-словакі прыблізіліся да Омска проціў большэвікоў выступілі селяне і казакі ні шкадаваўшыя узятых у палон.

Астрахань залежыць ад Царыцына у разе занятця якога, астраханцы вымруць ад голаду. У складзе мейсцовай чырвонагвардзіі зарэгістровано 4500 крымінадістаў. Начальнікам коннаго эскадрону быў ведамы рэцыдывіст Міхайлаў.

На кубанскім фронце увесь час ідзець змаганне с контррэволюцыяй.

Жыды на Беларусі.

(Бытавыя штрыхі).

II. *)

За увесь час суседняго жыцця беларусаў і жыдоў на Беларускай зямлі гэтыя дзьве нацыі псыхічна шмат пераняліі адна ад адной. У мовах, у звычаях, у легэндах, у будоўніцтве, у будзенным жыцці у іх формы так перамешываліся, што (болей усяго у жыдоў) прынялі новую самабытную акрасу.

Есьць агульныя жыдоўска-беларускія народныя мелёдзіі, пасловіцы, дзе жыдоўская і беларуская мовы перамешаны паміж сабою. У беларускай мове ёсьць словы: «хаўрус», «хэўра», «бахур», «адхаіць» і шмат іншых—чыста гэбрайскіх слоў. У жыдоўскай мове беларускіх слоў ёсьць тым болей.

У свой час, у 1911-12 г. г. жыдоўскі журналіст і рэдактар рожных жыдоўскіх часопісаў, п. Гурвіч, у Вільні звярнуў на гэту справу увагу. Сабраўшы цэлы зборнік жыдоўска-беларускіх пасловіц і дадаўшы да іх свае тлумачэння, ён паслаў да друку у заграпічны журнал.

Але гэтаго мало. Есьць цэлая жыдоўска-беларуская этнографія, якая чэкае свайго зьбірацеля. Такія пасловіцы, як: «Ні добра *рэйдэлэ* (гаворыць), а добра *мэйнэлэ* (думаіць).—ёсьць соткі.

Вось па жыдоўскаму альфабэту жабрацкае клянчанне, якое жыды сьпеваюць на дзядь:

«Ах, браццы, галубцы,
алеф, бойс, гімэль,
давайце галодному вашаму жэбраку хлеба троху.
далес, гой вов,
зайн, хэс, тэс,
Я—калека, ламака. Мучэльнік: Ні магу служыць
юд, коф, ламэд, мэм,
нун, самэх,
у пана. Чым кольвек ратуйце сьляпога татуню».
айэн, пэй, цадык, куф, рэйш,
шын, тэф.

Есьць вельмі пекная песьня, якая пачынаецца славамі: *„Абраам, Абраам, татуня ты наш..“* яна канчаецца на гэбрайску і пяецца на хасідскую мелёдзію.

Гэтакіх песьняў ёсьць шмат у жыдоў, як сурьёзныя, так сама і лёгкія прыпоўкі.

На першы пагляд магло-б здавацца, што у пераняцці культуры адной нацыей у другой, жыды, як нацыя болей культурная, павінна была мець перавагу над беларусамі і мець свой большы уплыў над імі, але на самым дзэлі ёсьць інакшай. Першая прычына гэтаго тая, што у гэтых двух нацый німа родства мовы і племён і тут як раз палякі і расійцы занялі першае мейсцо, асімілiруючы беларусоў. Другая прычына -гэто беларуская зямля. Дэкорацыя мейсцовай самабытнай прыроды мае у сабе такую вялікую сілу, што, на уплывы усеіякіх іншых культур дзействуе адпорна у адваротную старану. І тыя людзі з нашаго краю, якія пісалі па расійску або па польску і пажылі сабе славу у памянёных літэратурах, ні маглі выкараніць у сябе духу беларускай зямлі, каторы жыў у іх сэрцах. На кожным кроку чуецца, што гэтыя пісьменнікі—беларусы.

*) Гл. № 97.

Моц беларускай зямлі зрабіла тое, што у Беларуска-Літоўскім князьстве законы пісаліся па беларуску, прыдворная мова літоўскіх князёў была беларуская. А літвіны яшчэ цяпер нарэкаюць, што шмат з літоўскіх селян абеларуселі. У цяперашняй выстаўцы старасьвецкіх памяткаў у Вільні пад назваю: «Вільня—Менск» ёсьць каран беларускі, пісаны татарскімі літэрамі. Гэта паказуе да чаго можа даходзіць уплыў беларускай культуры!

Дзеля усяго гэтаго і ні дзіво, што жыды жыўшы тут, у сваёй новай бацькаўшчыне, болей пераймалі ад беларусоў, чымся беларусы ад іх. Магутная сіла беларускай зямлі дала асобы духоўны і унешні облік беларускім жыдам. Цяпер яны рожнюцца ад усіх другіх жыдоў, і іх па усяму сьвету называюць: «літвакамі».

З а бай сымпатычны беларуская газэта у Вільні «Наша Ніва» друкавала тыпы беларускіх жыдоў і жыдоўскіх сынагог у беларускім стылю. Калі мы глянем на жыдоўскае мястэчко на Беларусі, то пабачым на кожным кроку нешта роднае, сваё у будоўлях і ва усей абставе. Узяць жыдоўскіх пісьменнікаў з Беларусі,—то у іх творах чуецца заўсёды беларуская прырода—«родныя зьявы». Болей усіх гэто адбіваецца у творах жыдоўскаго клясіка Абрамовіча (Мандэле Мойхэр Сфорым) с Капыля.

І у другіх галінах штукарства у тутэйшых жыдоў чуецца беларускі дух.

Жыды, тры разы на дзень у малітвах сваіх успамінаючы Сыон, малевалі сабе у думках гэты Сыон, як пейкі ўзгоркаўзвышку, якія акружаюць іх тут на Беларусі. Жыдоўскае дзіця, аддаючы усе свае маладыя годы біблії у хэдэрах, мело перад сабою жывую біблію беларускіх ратаяў, беларускай спакойнай, ціхай зямелькі з лясамі, пушчамі, рачкамі, лугамі. Без гэтай беларускай прыроды, заўладаўшай іх душою ад радзэння, яны бы ні маглі у фантазіі сваей малеваць Палестыну, каторую яны малююць, маючы ўзорам беларускую зямлю.

Праўдзівымі і зразумелымі ёсьць апаведанні жыдоўскіх выкінутых адгэтуль эмігрантаў льосам у Амэрыку і інш., аб іх суму па бацькаўшчыне. І ні адпаведаюць праўдзе паказанні большасьці антысэмітаў, што жыды ні маюць пачуцця кахання да таей зямлі, дзе яны жывуць... Гэта была-б процiў законаў прыроды. Адно толькі—гэта цяга да бацькайшчыны у іх абвеяна асобым трагізмам. З адней стараны—жыццё на чужыне соткамі гадоў, дзе цюкапалі іх розныя антысэміты і жыдаеды, хочучы ні толькі зніпчыць іх фізычна як пагромамі і грабежствамі, але так сама і зганіць іх душу—рэлігію пад відам разных крывавых нагаворэў і крытыкі Тальмуду. З другой стараны—далёкая Палестына, ад якой яны выгнаны ўжо 2000 гадоў,—акрапляло самабытнай расою у душы кожнаго жыда тыя караніня, якія зьвязываюць яго з зямлёю, дзе ён жывець. Яго каханне да новай бацькаўшчыны—нэрвовае, балючае і нізразумелае прадстаўнікам другіх пацыяў.

III.

У беларускіх вялікіх местах як Вільня, Менск і інш., жыды мелі свае вялікшыя культурныя цэнтры: школы, абшчыны, прафэсіяльныя цэхі і др.

У той час, калі другія нацыі на Беларусі былі страшэнна сьціснуты расійскім урадам, калі беларусам зусім было забаронено друкаванае слово, жыды мелі у гэтым пейкую свабоду— нацыянальная жыдоўская культура магла развіцца без уселякаго, праве, тормозу. Тутэйшы «кагал»—быў свайго гатунку самаупраўленнем. С прычын усей гэтай абстовы, жыды з Беларусі давалі жыдом ўсяго сьвету найвялікшых вучоных у рэлігійным і пацыянальным жыцці.

Крыніцай гэтаму было место Вільня, бацькаўшчына віленскаго «гоэпа»—Раввi Ільі і другіх вялікіх талмудыстаў. Там друкаваліся самыя лепшыя гэбрайскія кнігі і быў да апошняго дня жыдоўскі вучыцельскі інститут. Нідарма Вільня называецца жыдамі «Літоўскім Ерузалімам» («Ieruśalaim dylito»).

У мястэчку Валожыне Віленск. губ. цэлымі векамі існавала жыдоўская духоўная акадэмія, скуль выхадзілі вялікія жыдоўскія вучоныя, пісьменнікі і раввіны для усяго сьвету жыдоў. (З Валожынскаго «Ешыбота» выйшоў і знамэніты жыдоўскі паэт Х. Н. Бялік). У Валожынскі «Ешыбат» прыезжалі вучыцца жыды с Каўказа, з Нямеччыны, з Амэрыкі і г. д.

Тут, па Беларусі, мело сваё развіццё і жыдоўскі містыцызм (Каббала). Вядомы цадыкі у Лібавічах, у Койданові, да каторых прыезжаюць веруючыя з усей Расіі. І ні дзіво што глаўнае развіццё жыдоўскай нацыянальна - рэлігійнай культуры мело мейсцо тут на Беларусі, дзе ім былі даны прывілегіі іщчэ пры кн. Вітоўце. Яны жылі тут як дзержаво у дзержаве, і іх «Кагал» меў нават право судзіць сваіх пабрацімаў. «Жыдоўскоэ пытанне» ужо стварыў тут расійскі урад—ранейшая Беларусь гэтаго і ні ведала.

У пэрыядзе змерцьвення беларускаго нацыянальнаго зсьведамлення, жыды, як і самі Беларусы, хоць добра ведалі беларускую мову, але глядзелі на яе, як на «мужыцкую», і. русыфікуючыяся самі, пасьведомлена служылі русіфікатарскай ідэі Вялікарасіі. Але гэта быў той багаты кляс, каторы атрымаў свою навуку у расійскіх школах, а што тычыцца простых местачковых жыхароў, то, апрача роднай мовы, яны ведаюць толькі беларускую.

Ад самаго пачатку беларускаго адраджэння, амаль ні побач с першымі піанерамі беларускаго руху пайшлі хоць і у малым ліку і жыды, выйшоўшыя з вёскі; хаця шырэйшыя інтэлігэнтныя масы жыдоўства, асабліва у местах, ні могуць іншчэ пазбыцца сукнэсаў расійскаго тут ўладання і усё іншчэ служаць праваднікамі руссіфікацыі.

З. Бядуля.

(Далей будзе).

Афіцыяльнае навядамленне нямецкага вярхоўнага камандавання за 20 жніўня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта.

Паўднёва-заходней Байеля артылерыйская дзейльнасьць ні адзін раз дасьцігла сільнай напружанасьці. У районі анорапый ад 18 жніўня вораг учора адновіў свае атакі. Паўнёвей Метэрэн, дзякуючы нашаму старанному агню яны ні маглі развівацца, паўночней Вье-Бэркен, яны адбіты у штыкавой бітве. На абодзьвум бакам р. Ліс некалькі дзён таму назад мы зноў адваевалі нашыя, пракрануўшыя да заходу ад Мэрвіль, аванпосты і перайшлі на лінію усходней гэтаго мястэчка. Варожымі часьцямі учора ноччу занят Мэрвіль. У районі Лапа і ля р. Скарпы адбіты ангельскія напады.

Група арміі Бэка.

Паўночней Лігона нашыя ударныя часьці атакавалі аванпостныя ангельскія лініі, захапілі у палон усіх знаходзячыхся у аконах салдат і адбілі частыя варожыя атакі. Паўднёва-заходней Шольн мы адбілі варожую атаку, быўшай пасьля кароткаго абстрэлу артылерыяй. Паўночна-заходней Руа вораг зноў атакаваў нашыя распалажэнні пры помачы танкоў. Ён адбіты. У праціг дня упарты бой паміж Бэўрань і Уазай. На вялікім абшары фронта французы атакавалі некалькі разоў, часьцю са сьвежымі дывізыямі. Паўднёвей Крапомесьніль іх атакі былі адбіты перад нашымі лініямі.

На абедзьвух старанах Фрэпіер яны былі разбіты кентр атакай. У упартай рукапашпай бітве вораг быў адбіты па між Ласіньі і Тыескур; часьці нашых перадавых ліній, каторыя яны часова уварваліся, былі зноў ачышчаны. Гэта жа само мы адстаялі нашыя дахадзячыя да Уазы лініі процiў упартых варожых атак да вечара вораг быў выкінуты свае ісходныя пазыцыі.

Паміж Уазай і Энай перастрэлка пасьля поўдня зно дасьцігла вялікаго напруджэння. К вечару варожая пяхот атакавала паміж Карлепонам і Нуўран. На абодвух атаку смых флангах ён адбіт у рукапашным баю; у сярэдзін фронта варожая пяхота была адбіта перад нашымі пазыцыя мі агнём артылерыі.

Армія генэрала Гальвіца.

Паміж Маасай і Мозолем нашыя рэкогносцыровачны атрады часта ўрываліся у варожыя акопы.

Лейтэнант Вельтьенс коў сваі 29, 30 і 31, віцэфельд фэбель Май сваі 21,22 і 23, лейтэнант Рэт сваю 22 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Што такое «агульна-нацыянальная» усенародная вайна процiў немцаў?

«Правда» ад 3-го жніуня піша пад гэтым загалоўкам вось што: Эсэры і меньшэвікі цягнуць рабочых у абойме «нашых хаўруснікаў». Яны клічуць пераходзіць на старану чэхо - славакаў, падкупленых французамі і разам з імі ваеваць процiў нямецкіх захватчыкаў і грабаўнікаў. Што такое «агульна - нацыянальная» вайна процiў немцаў у хаўрусі з ангельцамі і французамі.

1. «Агульна - нацыянальная» вайна—гэта *імпэрыялістычная* вайна. Гэто вайна за захват ангельцамі Малой Азіі, Пэрсіі, часьці нямецкіх каленій. Гэто вайна за захват французамі Эльзас-Летарынгіі, другой часьці нямецкіх заморскіх валадорстваў. Гэто вайна за захват японцамі Кітая. Гэто вайна за захват амерыканцамі паўднёвай Амэрыкі. Гэто вайна за захват хаўруснікамі усіх мароў і усісьветніх дарог. Гэто—вайна за тое, каб ні толькі астаткі Нямеччыны і Аўстрыі, але і *Расіі* аказалася на дне «хаўрускаго» мешка і каб зрабілася калоніяй, вотчынай хаўрускаго капіталу. І дзеля гэтаго, уцягіваючы Расію у вайну, хаўруснікі першым чынам захватываюць паўночныя берагі Расіі.

2. Гэта ні вайна, а здача у палон піяўкам французкаго капіталу. Французкія растоўшчыкі вымагаюць ад свабоднаго народу уплаты па царскім даўгам. Каб высмактаць з яго мільярды працэнтаў яны захватываюць Мурман, бяруць Белае мора. Даходамі с тамажэнь, портаў, жалезных дарог, с паўночных лясоў хочуць яны пакрыць плацяжы па пазыкам. Яны патрэбуюць назад заводы і фабрыкі, атабраныя у французкіх капіталістаў. Яны забяруць у сваі рукі яшчэ новыя багацці: каб ваеваць трэба браць у іх грошай, трэба лезьці з галавой у абоймы спрута.

3. Ваеваць разам з імі—значыць ваеваць с тымі, хто пасадзіў у турму Гільбо і Макліна, хто усьміра Ірляндзію, хто ламае стачкі ангельскіх рабочых. С тымі, процiў каго на зьездзі выступіла большасьць дэпутатаў французкіх рабочых. Ваеваць з імі, знача ваеваць процiў ангельскіх і французкіх *рабочых*, каторыя хочуць скінуць сваіх угнетацелеў. Ваеваць з імі—гэта разбіць сук, на якім сідзіць расійская рэвалюцыя і шкодзіць англо-французкім рабочым, ізнутры астанавіць разбойнічы набег на Мурман.

4. Ваеваць у хаўрусі з англо-французамі гэто знача ваеваць разам з друзьямі цара, каторыя укралі Міхаіла Романова каб пасадзіць яго на пасаду. З таварышамі Алексеева, Каледзіна, Дутова, чорнасоценай белагвардзейскай шайкі, каторая хацела у Яраслаўлі расчысьціць дарогу «хаўруснікам». «Агульна - народная» вайна—гэта вайна разам з Алексеевымі і яго афіцэрамі пад *іх начальствам*. Агульна-народная вайна гэта аднаўленне праў буржуазіі і паноў, аднаўленне царскай уласьці.

5 «Агульна-народная» вайна з немцам - гэта знача: аддаць ангельскім і французкім мяснікам мільены рускіх рабочых і селян, каб яны зноў рабілі з іх гарматнае мясо. Гэта знача держаць Расію окопамі, падставіць яе усіх жудасьцям імпэрыялістычнай бойні. Імпэрыялістычная война—гэта голад, яшчэ болей востры, чым той, каторы яна нам дала. Гэта зноў цяжкія налогі

6. Аднавіць імпэрыялістычную вайну пасьля перамогі рабочай рэвалюцыі у Расіі і у пачатку перамогі яе ва усіх ваюючых старанах—гэта значыць пагубіць расійскую рэвалюцыю, пагасіць вогнішчо усесьветняго пажару і памагчы міжнароднаму капіталу справіцца з рэвалюцыяй у сябе у тылу.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

На беларускія вучыцельскія курсы запісь у Юбілейным доме робіцца ад 10 да 1 гадз. у дзень. Запісь ідзе досі усьпешна. Курсанты будуі раздзеляны на 2 катэгорыі праўдзівая (с 4-х клясным пас вядчэннем) і слухачоў.

У делегацыі, у р.-к. епіска Лозінскаго, наведаўшай я 17-го жніўня па беларускаі і іным пытанням, прыйма учасьце—кн. Радзівіл, Скі мунт, Пупко і Крэпскі.

У Беларускай эканамічнай к місіі сэкрэтар прыймае ад да 2 гадзіны у дзень апра сьвят у канцэлярыі камісіі Койданаўскай вул.

27-го ліпня быў заслуха даклад контралера Вернік скаго аб звароце у Мен дзержаўнаго, селянскаго і банкаў, у свой час эвакуа ных.

Бежанскай камісыяй прэ новано Нар. Сэкрэтарыяту біцца праз свайго консула Маскве у расійскаго ура мажлівасьці пасланць прэдст ніка ад беларускай рэспубл у Смаленск, дзе ужо есь прэдстаўнікі усіх зацікаўлен у бежанскім пытанні дзерж дзеля таго, што цяпер у С ленску і яго ваколіцах ска лася шмат уцекачоў.

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтво «Т-во Заранка.»

Друкарня Я. А. Грынблята.